ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984

25 КАСТРЫЧНІКА

ЧАЦВЕР

№ 28 (1441)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### БЮРО ПАРТКОМА

на чарговым пасяджэнні разгледзела пытанне эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай работы на гістарычным факультэце, абмеркавала формы і метады работы куратараў са студэнтамі на геафаку.

Прааналізавана выкананне пастановы бюро парткома ад 29 лютага гэтага года «Аб рабоце прафкома універсітэта па развіццю сацыялістычнага спаборніцтва і мерах па павышэнню яго выхаваўчай ролі».

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

### СУР'ЁЗНАЯ РАЗМОВА

аб стане і мерах па далейшаму паляпшэнню палітыка-выхаваўчай работы і жыллёва-бытавых умоў студэнтаў, што жывуць у інтэрнатах, ішла на чарговым пасяджэнні рэктарата. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце У. С. Багданаў.

Разгледжана таксама выкананне планаў работы кафедраў і індывідуальных планаў выкладчыкаў за 1983—1984 гг.

**З. АЛЯКСАНДРАВА.**

### НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола універсітэта разгледзела пытанні справаздачнасці студэнцкіх будаўнічых атрадаў і захавання ўнутрысаюзнай дысцыпліны ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта. Па разгледжаных пытаннях прыняты адпаведныя пастановы.

**В. ЮР'ЕЎ.**

### ДА ЮБІЛЕЮ

факультэта ў чытальнай зале геаграфічных навук арганізавана выстаўка «Вучоныя факультэта — да юбілею». Тут дэманструюцца работы выкладчыкаў геафака, выдадзеныя ў нашай рэспубліцы. Вялікае месца займаюць выданні, якія выйшлі на англійскай, балгарскай, літоўскай, армянскай, чэхаславацкай мовах.

Да 50-годдзя на геаграфічным факультэце рыхтуюцца таксама выстаўкі «Геафак сёння», «Вучоныя-географы рэспублікі — нашы настаўнікі», «Выпускнікі факультэта: шляхі і лёсы».

**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

Савецкія прафсаюзы! Усямерна развівайце працоўную актыўнасць і творчую ініцыятыву працоўных!

Няхай жывуць савецкія прафсаюзы—школа кіравання, школа гаспадарання, школа камунізму!

*(З Заклікаў ЦК КПСС).*

## СЁННЯ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ ПРАХОДЗІЦЬ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ СТУДЭНЦКАЯ ПРАФСАЮЗНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ. САРДЭЧНА ВІТАЕМ ЯЕ ДЭЛЕГАТАЎ! МАТЭРЫЯЛЫ 1—2 СТАРОНАК ГАЗЕТЫ РАСКАЖУЦЬ ЧЫТАЧАМ АБ ПРАФСАЮЗНЫМ ЖЫЦЦІ.

## «ЗНАЙСЦІ ПАДЫХОД...»



ДРУГІ РАЗ старшынёй прафбюро мехмата выбралі студэнтку IV курса Іну Добыш.

**— Што новае з'явілася на факультэце за мінулы год? — перапытвае Іна. — Першае, і, відаць, самае важнае тое, што мы змаглі добра арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва паміж групамі на новай аснове, з больш аб'ектыўным падыходам. Пры вызначэнні групперрамоўжцаў улічвалася не толькі паспяховасць студэнтаў на працягу семестра, а таксама адзнакі ў час сесіі, удзел у грамадскім жыцці курса, патока, факультэта. Група, прызнаная пераможцай, узнагароджвалася, усе студэнты атрымлівалі стыпендыю.**

**Нядаўна на пасяджэнні прафбюро зноў разглядаліся пытанні арганізацыі спаборніцтва. Палічылі, што эфектыўным стымулятарам для яго арганізацыі стане ўзнагарода групы, заняўшай другое месца, турысцкай паездкай па гарадах краіны. Ці апраўдае сябе такое новаўвядзенне, пакажа час.**

Прафбюро факультэта заўсёды ў творчым пошуку. На яго рахунку шмат цікавых задум: разам з прафбюро ФПМ саўлены праграмы, па якіх два разы ў месяц праводзіцца кіналекторый, з наступнага года размеркаваннем пакояў у інтэрнаце будзе займацца не старшыня прафбюро, а кожная акадэмічная група.

**— Студэнты наперад ведаюць, каму патрэбна дапамагчы з інтэрнатам, — заўважае Іна.**

Ёсць у яе адна вельмі каштоўная рыса характару, якая перарасла ў абавязковую для кіраўніка, арганізатара. Гэта давер да студэнтаў, да сваіх таварышаў, бо аднаму чалавеку немагчыма зрабіць усё самому. Таму неабходна, каб у кожнай групе нехта рыхтаваў мерапрыемствы, самастойна і без напамінку.

**— У мінулым годзе добра працавалі прафоргі. Яны заўсёды ў курсе ўсіх падзей групы, факультэта. Таму вынікі іх працы адчувальныя, — расказвае Іна.**

На факультэце, вядома, ёсць свае цяжкасці, недапрацоўкі. Па тым, з якой заклапочанасцю расказвае старшыня аб усіх цяжкасцях, было відаць, што гэта яе асабістая справа.

Кожны дзень у прафбюро заходзяць студэнты факультэта, прафоргі. Яны звяртаюцца да І. Добыш па розных пытаннях. Спраў шмат, але Іна добра ведае, што галоўны спосаб пераадолення цяжкасцей — гэта не абыход вострых вуглоў, вострых пытанняў, а іх вырашэнне. У гэтым ёй дапамагаюць самі студэнты, прафоргі. Важна толькі знайсці да кожнага падыход.

**С. РАМАНАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**НА ЗДЫМКУ: з якім бы пытаннем ні звярнуліся студэнты да І. Добыш (справа), яны ўпэўнены, што яно не застанецца без увагі.**

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

● На ўліку ў студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна 9648 чалавек. У складзе 11 факультэцкіх арганізацый 401 група.

● Пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва выходзілі прафсаюзныя арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта, ФПМ, гістарычнага факультэта.

● У сямі інтэрнатах пражывае 5118 студэнтаў, што складае 67 працэнтаў ад усіх іншагародніх навучэнцаў. Лепшых паказчыкаў у рабоце дабіліся інтэрнаты № 7, № 1, № 6.

● Пасля мінулай канферэнцыі прайшло тры гады. За гэты час па пуцёўках прафсаюзнага камітэта пабывалі: у санаторыях — 197 чалавек; у дамах адпачынку — 187 чалавек; на турысцкіх базах — 287 чалавек; у прафілакторыі — 2130.

● У лагеры працы і адпачынку «Гурзуф» пабывала 500 чалавек, а ў лагеры «Феадасійскі» — 337 чалавек.

● Звыш 1818 студэнтаў адпачылі ў спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач».

● Прафкомам выдаткавана на культурна-масавыя мерапрыемствы больш за 13573 рублі, на вучэбна-спартыўныя — больш за 5299 рублёў. На матэрыяльную дапамогу студэнтам выдадзена 17006 рублёў.

● ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

# ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ У СПРАВЕ

**Здаецца, зусім нядаўна складаліся планы работы прафсаюзнага бюро, абмяркоўваліся мерапрыемствы. Ужо прайшоў год. І аб'ява паведамляла аб справаздачна-выбарнай канферэнцыі.**

Студэнты факультэта прыкладной матэматыкі сабраліся ў прасторнай зале Палаца культуры Белсаўпрофа. Старшыня прафбюро Мікалай Дземеш аб'явіў аб пачатку канферэнцыі.

**Да якіх вынікаў прыйшла за год прафсаюзная арганізацыя? Што новае з'явілася ў падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў? Як палепшыць работу прафбюро? Гэтыя і іншыя пытанні патрэбна было вырашыць на канферэнцыі.**

**Са справаздачным дакладам выступіў старшыня прафсаюзнага бюро М. Дземеш. Ён ахарактарызаваў работу кожнай камісіі, вызначыў лепшыя і горшыя бакі ў іх працы.**

Нездарма арганізацыя факультэта прыкладной матэматыкі лічыцца адной з лепшых ва універсітэце. За першую палову гэтага года ФПМ у сацыялістычным спаборніцтве сярод прафсаюзных арганізацый універсітэта падзяліў з мехматам першае і другое месцы. Вялікую работу правялі актывісты факультэта.

Арганізацыйна-масавая камісія імкнулася наладзіць цесную ўзаемасувязь з усімі прафсаюзнымі групамі, з чым яна паспяхова справілася. Рэгулярна праходзіла вучоба прафактыву. Асаблівую ўвагу ўдзялялі праформгам першага курса. І кожны з іх ведае свае абавязкі.

**Аляксандр Мураўёў узначальваў жыллёва-бытавую камісію. Разам з А. Тасько і В. Акулічам ён займаўся справамі непасрэдна ў інтэрнаце. Спісы пражываючых тут заўсёды складаюцца загадзя. Аднакурснікаў селяць разам, улічваючы асабістыя пажаданні студэнтаў. Работы шмат, бо студэнты факультэта жывуць у двух інтэрнатах — № 6 і № 5.**

**Нямала добрых спраў і мерапрыемстваў арганізавала і правяла спартыўна-аздараўленчая камісія. За мінулы год больш за 200 чалавек пабывалі ў санаторыях, прафілакторыях, лагерах працы і адпачынку.**

**Вучоба — галоўная праца студэнта. Прафбюро факультэта рабіла ўсё магчымае каб палепшыць умовы падрыхтоўкі студэнтаў да сесій. Члены камісіі клапаціліся, ці ўсе юнакі і дзяўчаты забяспечаны падручнікамі, ці ёсць магчымасць займацца ў чытальных залах інтэрнатаў. Аб рабоце ВВК расказала яе старшыня Таццяна Лапко. Яна звярнула ўвагу на тое, што ў некаторых групах абыякава адносяцца да студэнтаў, якія прапускаюць заняткі. Старшыня падкрэсліла неабходнасць сустрэч першакурснікаў са старэйшымі студэнтамі. Не вельмі радуюць матэматыкаў вынікі летняй сесіі — паспяховасць склала 90 працэнтаў.**

За добрасумленныя адносіны да сваіх абавязкаў заслугоўваюць вялікай падзякі члены прафбюро Наташа Малахава, Ала Коман, Таццяна Канькова. Зоя Калтунчык была намеснікам старшыні прафбюро, паспяхова кіравала арганізацыйна-масавай камісіяй. Таму невыпадкова яе абралі старшынёй прафбюро. Новы старшыня ўпэўнены, што прафсаюзная арганізацыя факультэта прыкладной матэматыкі і ў будучым будзе ў ліку правафланговых ва універсітэце.

**І. НОВІКАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

# ГАРТУЮЦЦА ТАЛЕНТЫ

**Сёлетні год для студэнцкага клуба — справаздачны. З якімі вынікамі падышоў ён да канферэнцыі? З такім пытаннем я звярнулася да старшыні клуба У. МАКАРЭВІЧА.**

— Наш клуб налічвае 34 мастацкія калектывы, з іх пяць маюць ганаровае званне народных. Слава народных калектываў — харавой капэлы, агітбрыгады, тэатра, аркестра народных інструментаў, ансамбля танца «Крыжачок» — вядома далёка за межамі нашага універсітэта. У горадзе Каўнасе на конкурсе змешаных акадэмічных хароў ВНУ «Ювентус» наша харавая капэла атрымала галоўны прыз за лепшае выкананне патрыятычнай песні. Капэла неаднаразова выязджала за межы рэспублікі з канцэртамі і ўсюды яе сустракалі моцнымі сяброўскімі апладысментамі.

**Аб поспехах нашай народнай агітбрыгады таксама можна гаварыць толькі добрыя словы. Некальні разоў яна пацвярджала сваё ганаровае званне. Гастраліравала па гарадах Комі АССР, выступала ў Адэскім універсітэце імя Мечнікава, на рэспубліканскім конкурсе народных агітбрыгад калектыў заняў другое месца. Маршрутамі калектыву сталі новабудоўлі рэспублікі, калгасы і саўгасы, школы.**

**А народны тэатр падрыхтаваў спектакль «Бяда ад пяшчотнага сэрца» па п'есе Ф. Салагуба. Зараз рыхтуецца прэм'ера спектакля па аповесці Б. Васільева «А досвіткі тут ціхія».**

**Ліпень гэтага года для ансамбля танца «Крыжачок» быў знамянальным. Ансамбль выступаў на свяце песні і танца «Гаўдэамус-84», а ў кастрычніку разам з нямецкімі сябрамі адзначыў 35-годдзе утварэння ГДР у Йенскім універсітэце імя Ф. Шыллера.**

**«Неруш» — так называецца фальклорна-этнаграфічны ансамбль, лаўрэат тэлеконкурса «Юнацтва камсамольскае маё». Надоўга застануцца ў памяці членаў ансамбля новыя знаёмствы з будаўнікамі Свярдлоўскай вобласці, дзе калектыў выступаў у мінулым годзе. Нядаўна калектыў падрыхтаваў новую канцэртную праграму «Беларускі зімовы абрад».**

Калектывы мастацкай самадзейнасці выязджаюць у падшэфную гаспадарку — саўгас «Гарадок» Уздзенскага раёна, — на новабудоўлі рэспублікі і краіны. Цікава і змястоўна праходзілі конкурсы агітбрыгад СБА, творчыя сустрэчы з маладымі артыстамі мінскіх тэатраў, конкурсы сярод інтэрнатаў на лепшую канцэртную праграму «Студэнцкая субота», на лепшы фотарасказ «Героі сярод нас» і многія іншыя мерапрыемствы.

**Неабходна назваць прозвішчы тых, хто сваёй працай спрыяе добрай славе нашых калектываў: Наташа Янушкевіч, Люда Згероўская, Люда Глембоцкая, Саша Галалобаў з ансамбля «Крыжачок», Ала Жукавец з аркестра народных інструментаў, Іван Жылінскі з харавой капэлы, Сяргей Змачынскі, Юра Кручонак, Алег Янкоўскі, Люда Півавар, Наташа Картавік з агітбрыгады, Віктар Схаба, Таня Сташэўская, Рыта Харытончык з тэатра.**

**Запісала**
**І. КЕЗІК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

● НА РАХУНАК ХАРЧОВАЙ ПРАГРАМЫ



СУПРАЦОЎНІКАМІ, выкладчыкамі і студэнтамі геаграфічнага факультэта паспяхова праводзяцца навуковыя даследаванні, накіраваныя на рашэнне Харчовай праграмы СССР. У гэтым годзе па заданню Інстытута «Белгіправодгас» Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР пачаты работы па навуковаму ландшафтна-экалагічнаму абгрунтаванню супрацьэразійных меліярацыйных мерапрыемстваў Беларускага Паазер'я. Найбольш актыўны ўдзел у гэтых даследаваннях прымуць супрацоўнікі праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў, галіновай лабараторыі возеразнаўства, кафедраў фізічнай геаграфіі СССР, агульнага землязнаўства, глебазнаўства і геалогіі.

**НА ЗДЫМКУ:** ідзе абмеркаванне задач навуковых даследаванняў на меліярацыйным аб'екце. Справа налева: в. а. дацэнта кафедры фізічнай геаграфіі СССР П. А. Каўрыга, аспірант МДУ імя М. В. Ламаносава В. А. Каляда, старшыя навуковыя супрацоўнікі Праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў В. М. Яцухна, М. К. Васілеўская, студэнты геаграфічнага факультэта

Фота **А. Прымака.**

**Юнакі і дзяўчаты! Нястомна авалодвайце ведамі, культурай, прафесіянальным майстэрствам! Прыумнажайце рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі Камуністычнай партыі і савецкага народа!**

**Вучыцеся па-ленінску жыць, працаваць, змагацца!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС).*

● КАМСОРГІ, ЯКІХ МЫ ВЫБІРАЕМ

# АЎТАРЫТЭТ НАДЗЕЙНАГА ЧАЛАВЕКА

**Камсамольскі сход трэцякурснікаў 8 групы механіка-матэматычнага факультэта закончыўся тым, што камсорг... расплакалася.**

ДЗЯЎЧАТЫ РАЗГУБІЛІСЯ. Ніколі б не падумалі, што вось так, пры ўсіх іх, заўсёды строгая, стрыманая Алена можа плакаць. Дзівачка. Яны пра яе столькі слоў добрых сказалі, а яна — у плач. Але гэта былі не слёзы роспачы, не слёзы чалавека пакрыўджанага, зняважанага. Гэта былі слёзы чалавека шчаслівага, і шчаслівага іменна тым, што ты патрэбны людзям. Патрэбны, бо нават самыя строгія крытыкі — сябры — гавораць табе словы вялікай удзячнасці за гарачае сэрца, шчырую душу, неспакойны характар. І хіба, перажыўшы такія мінуты, Алена Каршунова, камсамольскі важак групы, зможа калі-небудзь здрадзіць сваім сяброўкам, зрабіць што-небудзь не так? Яны ж паверылі ў яе яшчэ на першым курсе.

Тады мала ведалі адна пра адну. Але калі сталі перад выбарам камсорга групы, чамусьці аднагалосна вырашылі: ім будзе Алена. Прыглянулася яна дзяўчатам. І сёння яны ўсе як адна лічаць: з камсоргам пашанцавала. Бо дзе больш праходзяць такія сур'ёзныя



● АТАКУЕМ ФАРМАЛІЗМ ●

# «АБАВЯЗУЮСЯ

**У мінулую нядзелю ў акадэмічных групах універсітэта адбыліся справаздачна-выбарныя камсамольскія сходы, на якіх адно з галоўных месц займала грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» Тое, як праходзіла гэта мерапрыемства ў асобных групах, і стала аб'ектам зацікаўленасці нашага карэспандэнта. Прапануем яго крытычныя нататкі.**

...10 ГАДЗІН РАНІЦЫ. Юрыдычны факультэт. Аўдыторыя № 604. Тут з мінуты на мінуту пачнецца (а наогул ужо павінен быў пачацца) камсамольскі сход 2 групы 2 курса. Але, як бачна, славутая «юрыдычная дакладнасць» у будучых юрыстаў пакуль што не ў пашане. З 25 чалавек у аўдыторыі можна налічыць толькі 17. Камсорг У. Протас зноў і зноў выглядвае за дзверы на грукат чарговых крокаў у калідоры. Але дарэмна.

Студэнты тым часам пачынаюць патроху пазяхаць, гледзячы ў вокны. Дзяўчына, што сядзіць праз праход ад мяне, завалодала «Асабістым комплексным планам» сваёй сяброўкі і старанна перапісвае яго пункты ў свой асабісты комплексны... У 10 гадзін 10 мінут аўдыторыя вітае трох студэнтак, якія спазніліся. «Ну, адсутнічае толькі лепшая частка чалавецтва», — спрабуе жартаваць камсорг. Гумар гумарам, а пачатак сходу зацягваецца ўжо на 20 мінут.

Нарэшце! «Лепшая частка чалавецтва» — два хлапчыны, зацягнутыя ў чорныя скураныя паліто, — без усялякіх тлумачэнняў займаюць свае месцы. Можна пачынаць.

А зараз прытрымаем шчодрае на апісанні пяро і зробім першы вывад: думаецца, не толькі У. Протас не здолеў забяспечыць належную арганізацыю такога адказнага мерапрыемства, якім з'яўляецца камсамольскі сход. Не надта

**ГЭТЫ сонечны асенні дзень для ўсёй камсамоліі ўніверсітэта стаў сапраўдным святам. Па-святочнаму апранутыя, з камсамольскімі значкамі на грудзях юнакі і дзяўчаты прыйшлі ў свае групы, каб крытычна ацаніць сябе, строга спытаць таварышаў: як прайшоў яшчэ адзін год камсамольскага жыцця? Чым ён быў запоўнены? Наколькі стаў карысным?**

**У групах прайшлі справаздачна-выбарныя сходы разам з грамадска-палітычнай атэстацыяй удзельнікаў Ленінскага заліку і атэстацыяй па ГПП.**

камсамольскія сходы? Дзе камсамольскае бюро групы так строга ставіцца да двоечнікаў? Дзе бываюць такія бурныя спрэчкі? Яшчэ і зараз дзяўчаты ўспамінаюць дыскусію па газетнаму артыкулу «Фірмовы міраж». А колькі цудоўных спраў на рахунку шэфскага сектара групы! На сходзе амаль усе дзяўчаты выказалі жаданне працаваць са школьнікамі, і тут жа паднялі праблему: навошта ў камітэце камсамола кожны год мяняюць падшэфныя арганізацыі? Прывыклі да адной школы, з вучнямі пазнаёміліся. А на наступны год — новыя знаёмствы, зноў патрэбна ўсё пачынаць спачатку. Куды лепш было б весці падшэфную работу ў адной школе на працягу ўсёй вучобы ва ўніверсітэце. У групе прывыклі ставіць пытанні і заўсёды даваць на іх адказ. «А інакай у чым жа сэнс усёй нашай работы?» — лічыць Алена.

Не забудуць дзяўчаты і паходы ў кіно, і палітінфармацыі, і разам праведзеныя вечары. Вось як той, прысвечаны жыццю і творчасці У. Высоцкага. І яшчэ шмат добрых спраў, на якія так багата група, надоўга застануцца ў памяці.

Не будзем гадаць аб тым, як бы жыла група, калі б не было ў ёй Алены Каршуновай, але з упэўненасцю скажам: у ёй група знайшла сапраўднага важака, надзейнага чалавека. Вось як гавораць аб гэтым дзяўчаты:

**МАРГАРЫТА ЕМЯЛЬЯНАВА: Лічу выбар наш адзіна правільным. Алена па праву карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Калі яна што-небудзь скажа, да яе прыслухаюцца, за ёй пойдуць. Неяк прапанавалі нам папрацаваць на будаўніцтве дзіцячага сада. Справа была не абавязковай, і працаваць мы маглі па свайму жаданню. Група была ў нерашучасці. І тады Алена сказала: «Папрацуем». І сама рушыла наперад. Разам з ёй працавала ўся група.**

**НАТАЛЛЯ КУДЛА: Мы ўсе ведаем яе па групе. А я да таго ж два разы была з ёй у будатрадзе. Ведаеце, і там яна такая ж актыўная і працалюбівая.**

**ІРЫНА КАЧУБЕЙ: У гэтай групе я вучуся нядаўна. Але зусім не адчуваю сябе тут лішнім чалавекам. Дружная атмасфера ў групе проста здзіўляе. І ў гэтым немалая заслуга Алены. Яна створана для камсамольскай работы. І яе нікім не заменіш.**

А што думае наконт сваёй групы сама Алена?

**— Група наша цудоўная. — Алена з вялікім задавальненнем гаворыць гэтыя словы. — Дзяўчаты ўсе дружныя, працавітыя, вясёлыя. З такімі людзьмі радасна працаваць. І дарэмна яны мяне так расхвальваюць. Нават самы здольны камсорг не можа што-небудзь зрабіць, калі побач з ім няма людзей зацікаўленых, энергічных, актыўных. Не ведаю, якім бы камсоргам была я, калі б побач са мной не было Маргарыты Кнацько, Маргарыты Емяльянавай, Веры Пятровай... Праўда, ёсць у нас яшчэ шмат праблем...**

**Яшчэ на першым курсе Ірына Заслонкіна стала прафоргам групы. Са сваімі абавязкамі спраўлялася не вельмі добра. І ўжо тады група крытычна ацаніла яе работу. Вырашылі, што групе не патрэбны тыя, хто працуе не ў меру сваіх магчымасцей. Дзяўчына папрасілася: маўляў, вопыту мала, выпраўлюся. Але па-ранейшаму работу вяла нядобрасумленна. Па яе віне не ўся група атрымлівала стыпендыю, хаця мела на гэта права. І што самае дрэннае: яна думае толькі пра сябе. Сама са стыпендыяй, і больш нічога яе не цікавіць. Думаецца, што для Ірыны гэты сход стане ўрокам на ўсё жыццё.**

**— Мы прывыклі да таго, — працягвае далей Алена, — што калі чалавек робіць памылкі, гаварыць аб іх яму ў вочы. Таму і няма ў нас крыўд, папрокаў.**

Таму так высока цэніцца аўтарытэт камсорга. Калі выбіралі сакратара, дзяўчаты не задумваючыся прагаласавалі за Алену.

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**

**НА ЗДЫМКУ:** са справаздачай выступае камсорг Алена Каршунова.

**Фота А. ВАЛОШЫНА.**



# З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА ГРУПА?

З ЧАГО пачынаецца камсамольская група? З «бульбы» — лічаць адны, з агульных спраў — упэўнены другія. А вось камсамольцы 3 курса 10 групы факультэта прыкладной матэматыкі сцвярджаюць, што з таго і другога разам. І яшчэ — з усмешкі. З добрай, ласкавай усмешкі. «Вось як у нас было, — гаворыць Валянціна Беляковіч, камсорг групы. — Сустрэліся 1 верасня два гады назад дванаццаць дзве дзяўчыны і прадстаўнік «моцнага» полу. Сустрэліся — усміхнуліся. Потым дзевяць дзён разам вучыліся. Разам рабілі першыя крокі ў студэнцкае жыццё. Ну, а потым, вядома, была «бульба»: з ударнай працай, з песнямі ля кастра, са смехам, гумарам. А праз год зноў была «бульба». І зноў усёй групай, разам. Толькі сталі мы сур'ёзнымі, пасталелі. Шмат агульных спраў стала аб'ядноўваць нас».

Ну, а зыходзячы з таго, як праходзіла грамадска-палітычная атэстацыя ў гэтым годзе, можна з упэўненасцю сказаць, што група ператварылася ў адзіны калектыў, які жыве агульнымі справамі, агульнымі радасцямі і няўдачамі. З 30 камсамольцаў 13 былі атэставаны на «выдатна», 6 атрымалі адзнаку «добра».

**— Гэта цалкам аб'ектыўныя адзнакі, — лічыць куратар групы У. С. Глушанкоў. — Асноўныя якасці, якія вызначаюць камсамольцаў групы, — актыўнасць і самастойнасць. Іменна яны і дазваляюць групе выходзіць пераможцай у сацыялістычным спаборніцтве сярод 2—4 курсаў факультэта.**

**— Я лічу, што наша група пачалася з сесіі, — такой думкі прытрымліваецца Галіна Марудка. — Адна дзяўчына атрымала адразу дзве двойкі. Мы вельмі перажывалі, дапамагалі ёй. А потым, можаце ўявіць, у аўдыторыі, дзе ідзе экзамен, застаўся адзін чалавек. І ўся група з вялікім хваляваннем чакае яго, аднаго.**

**— Ну, а хіба не здружыў, не зрадніў нас той «агеньчык», які праводзілі на Новы год? — дадае Наталля Карповіч. — Мы ж і стол падрыхтавалі, і культурную праграму зрабілі. Нават вершы самі склалі. Цудоўна было! І ў тыя мінуты думалася: «Як добра, што ў цябе ёсць такія сябры, такая група».**

Дзяўчаты жыва, актыўна выказвалі свае меркаванні на сходзе. Закраналі пытанні, якія хвалююць, гаварылі аб планах на будучае. І ўжо нязменна прысутнічала ва ўсіх выступленнях зацікаўленасць, жаданне кожнага быць у гушчыні падзей. Тут няма «лішніх» людзей, тут жывуць адзінай дружнай сям'ёй.

**— Вось ужо два семестры, як сесію здаём без двоек. Утрымаемся, дзяўчаты? — пытаецца камсорг Валянціна Беляковіч.**

**— Будзем старацца, — такое аднагалосае меркаванне групы.**

І яны ўтрымаюцца. Яны будуць вучыцца і працаваць яшчэ лепш — яны адно цэлае, калектыў.

**А. АНАТОЛЬЕВА.**

**НА ЗДЫМКУ:** адна з лепшых груп ФПМ у час атэстацыі.

Фота **А. Валошына.**

# АБАВЯЗКОВА АБАВЯЗАЦЦА...»

суцяшае думка, што на іншых факультэтах было значна лепш.

Частка камсамольцаў наогул не з'явілася на сход і атэстацыю. Другая частка прыйшла, як кажуць, «адбыць мерапрыемства»: не падрыхтаваліся ні да справаздачна-выбарнага сходу, ні да атэстацыі. У групе 4 курса аддзялення філасофіі на гістфаку адна камсамолка так і не здолела прыпамятаць, як называўся прыняты дакумент аб далейшым удасканаленні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў выхаванні моладзі. І гэта ў той час, калі першым пунктам камсамольскага сходу значылася абмеркаванне гэтай пастановы!

Яшчэ адзін трывожны недахоп: у некаторых групах комплексныя планы не былі ў пачатку мінулага навучальнага года зацверджаны на камсамольскіх сходах. У выніку атрымалася сітуацыя, калі гэтыя планы сталі чыста індывідуальнымі, у якіх не ўлічваюцца інтарэсы, патрэбы групы. Гэта заганная практыка.

Шмат нараканняў заслугоўваюць і самі планы-абавязацельствы, якія складаюць камсамольцы. Галоўны іх недахоп — гэта адсутнасць канкрэтнасці. Вось, напрыклад, адно з абавязацельстваў Генадзя Віталеўскага (2 курс юрыдычнага факультэта): «удзельнічаць у навукова-даследчай рабоце кафедраў». Вось так, паабяцаў, як адрэзаў. На юрыдычным факультэце сем кафедраў і, згодна дадзенаму абавязацельству Г. Віталеўскага, кожная з іх мае права запатрабаваць ад яго справаздачу аб выкананай навукова-даследчай рабоце. Цікава было б паслухаць аргументы абавязкадаўцы!

Або вось, калі ласка, «перлы» іншага характару: «пастаянна наведваюць заняткі па фізічнай падрыхтоўцы» (Алена Вараб'ёва, юрфак). Ці яшчэ: «напісаць курсавую работу» (Алена Свечнікава, мехмат).

Такіх «абавязацельстваў» можна было б сабраць, як кажуць, цэлы кораб. І паколькі справаздачы ў некаторых камсамольцаў па сутнасці і грунтуюцца на вось такіх «мерапрыемствах», то хацелася б унесці поўную яснасць у паняцце «абавязацельствы асабістага комплекснага плана ўдзельніка Ленінскага заліку».

Такое абавязацельства — гэта напрамак у самаадукацыі, які прадугледжвае хоць маленькі, але крок наперад, крок чалавека да самаўдасканалення. Але не фармальны, не пасіўны крок хадака ў агульным натоўпе. Гэта перш за ўсё самастойны, асабісты крок. Іменна яго і шукаем, знаёмячыся з абавязацельствамі. І ў кожным другім знаходзіш: «здаць летнюю сесію без «здавальняюча», на «добра» і «выдатна». Аб чым гаворыць такое абавязацельства? Аб тым, што студэнт абавязуецца выконваць тое, што з'яўляецца яго элементарным абавязкам. Абавязкам, а не адным з чарговых пунктаў: прымаць — не прымаць.

Яшчэ для прыкладу: «удзельнічаць ва ўсіх агульнауніверсітэцкіх, факультэцкіх і групавых мерапрыемствах. Мець грамадскае даручэнне». Прыпамятаем радкі Статута ВЛКСМ: «Член ВЛКСМ абавязаны... актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці краіны, паказваць прыклад моладзі ў выкананні свайго грамадскага абавязку, праяўляць ініцыятыву і самастойнасць». Сэнсавыя значэнні гэтых дзвюх цытат накладваюцца адно на адно па ўсіх параметрах. Так што нічога новага, па сутнасці, у абавязацельствах і няма. Няма кроку наперад — ёсць паўтарэнне не аднойчы паўторанага. Карацей, абавязацельства дзеля абавязковага абавязацельства...

Вось такія агульныя заўвагі. Што б хацелася «сказаць на перспектыву». Студэнцкае жыццё для маладога чалавека — гэта не толькі падрыхтоўка да будучай дзейнасці, але і ступень самога жыцця, яго значная частка. К. Д. Ушынскі лічыў перыяд жыцця чалавека ад 16 да 23 гадоў рашаючым: «Тут іменна заканчваецца перыяд нараджэння асобных уяўленняў, і калі не ўсе яны, то значная частка іх грунтуецца ў адну сістэму, дастаткова шырокую, каб даць рашаючую перавагу таму ці іншаму напрамку мыслення чалавека і яго характару».

Вядома, што студэнт не толькі аб'ект мэтанакіраванага ўздзеяння — выхавання і навучання, — але і актыўны суб'ект сацыяльнага жыцця. Што дасць яму ВНУ — гэта ў значнай ступені залежыць ад яго самога, ад яго адносін да справы.

Хутка ў групах камсамольцы будуць прымаць і зацвярджаць новыя комплексныя планы ўдзельніка Ленінскага заліку на бягучы навучальны год. Думаецца, што было б неапраўданай раскошай зноў «спатыкацца» на тых жа «калдобінах».

**Ч. ВІКТАРАЎ,**
**наш кар.**

# У АПОШНІХ ЗАБЕГАХ

## ВЫЗНАЧЫЎСЯ ПЕРАМОЖЦА КУБКА ПЕРШЫХ КУРСАЎ НА ПРЫЗ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

**● Першы курс геафака — уладальнік прыза нашай газеты**

**Кубак першых курсаў па бегу пачаўся з урачыстага адкрыцця. Капітаны каманд узнялі сцяг спаборніцтваў. Хутка быў дадзены старт. Каля 1300 першакурснікаў выйшлі на бегавыя дарожкі стадыёна.**

**● Лада Блінова (ФПМ) і Вячаслаў Кузьмін (геафак) паказалі лепшыя рэзультаты**

**Рэпартаж з гэтых спаборніцтваў вядуць нашы спецыяльныя карэспандэнты Ігар АДАМОВІЧ і Уладзімір АБРАМОВІЧ.**

НА ДЫСТАНЦЫІ 1000 метраў барацьбу пачалі юнакі фізічнага факультэта. Ужо пасля першага забегу высветлілася, што новых рэкордаў не будзе. Студэнты паказвалі вынікі, якія не толькі не дасягаюць рэкорда кубка (Андрэй Міхейкін — 2,46), але і нарматыва ГПА. Нярэдка здаралася, што разрыў паміж першым і апошнім бегуном быў каля мінуты. Па гэтай прычыне каманды страчвалі шмат ачкоў. Незадаволены такімі вынікамі застаўся трэнер зборнай універсітэта па лёгкай атлетыцы Віктар Якаўлевіч Шпігаў. На наша пытанне ён адказаў:

**— Вынікі невысокія. Добрага папаўнення ў зборную амаль няма. А наперадзе шмат адказных спаборніцтваў. Ёсць некалькі спартсменаў, асабліва дзяўчат, якія могуць паказаць высокія вынікі. Напрыклад, Анжэла Шыдлоўская (факультэт радыёфізікі і электронікі).**

### ● ПЕРШЫЯ ЛІДЭРЫ

ФАКУЛЬТЭТ радыёфізікі і электронікі — пастаянны прэтэндэнт на высокія месцы ў спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы і кросу. Таму намеснік дэкана факультэта па фізвыхаванню і спорту В. В. Жукаў спадзяваўся на сваіх першакурснікаў.

Анжэла Шыдлоўская упэўнена фінішыравала ў сваім забегу. Яе вынік — 1 мінута 38 секунд — стаў лепшым часам дня, але дзяўчына была незадаволена:

**— Раней я бегала 500 метраў значна лепш. Але доўга не трэніравалася. Ды і саперніц у забегу не было.**

Першым з трох мінут «выбег» на кіламетровай дыстанцыі Фёдар Шымко. Многія юнакі факультэта выканалі нарматывы на значок ГПА. У параўнанні з мінулым годам, калі яны занялі чацвёртае месца, рэзультаты радыёфізікаў былі горшымі. Даводзілася спадзявацца, што фартуна павернецца тварам да іх, і наступныя каманды выступяць не лепш.

### ● ШТО НАЗВАЦЬ УДАЧАЙ!

І ПАХВАЛЯВАЦЦА давялося радыёфізікам у наступных забегах, калі на бегавыя дарожкі выйшлі біёлагі. Першакурснікі біяфака ніколі не вызначаліся ў такіх спаборніцтвах. А Света Грыб прабягае 500 метраў за 1 мінуту 35 секунд. Яе сяброўка Жана Гусева прайграе ёй усяго дзве секунды. Вельмі прыемна, што студэнткі біяфака паказалі нядрэнныя рэзультаты і сталі прызёрамі спаборніцтваў.

А перамагла на дыстанцыі 500 метраў Лада Блінова з факультэта прыкладной матэматыкі. Яе вынік — 1 мінута 34 секунды.

**— Я не спадзявалася, што займу першае месца, — сказала Лада. — Бегам спецыяльна не займаюся. Мой асноўны від лёгкай атлетыкі — скачкі ў вышыню. Сёння беглася лёгка. Настроіла сябе на высокі рэзультат, і вось — перамога.**

Юнакі юрыдычнага факультэта Вячаслаў Поташ і Дзіма Дубаграеў прабеглі 1000 метраў адпаведна за 2 мінуты 55 секунд і 2 мінуты 58 секунд. Але гэтыя факультэты не змаглі апярэдзіць факультэт радыёфізікі і электронікі, бо лідэраў не падтрымалі таварышы.

Намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту хімічнага факультэта У. С. Башаркевіч зусім справядліва лічыць, што ад настрою студэнтаў залежыць многае. Таму да самага старту ён падбадзёрваў першакурснікаў. Высокіх рэзультатаў не было. Тым не менш юнакі і дзяўчаты беглі дружна, і кожны адчуваў адказнасць за свой факультэт. Хацелася б пажадаць, каб і на іншых спаборніцтвах хімікі выступалі так адказна. Іх агульны вынік уступаў толькі факультэту радыёфізікі і электронікі.

### ● «ЛЕНА, ДАВАЙ АДСТАНЕМ!»

ХАРАКТЭРНАЙ рысай кубка першых курсаў па бегу з'яўляецца тое, што адказнасць за вынік каманды кладзецца на кожнага ўдзельніка. І па тым, як бягуць дыстанцыю студэнты, адразу відаць, наколькі дружным з'яўляецца курс.

Студэнты мехмата і філфака ўстанаўлівалі дасягненні па... павольнасці бегу. Кіламетр яны пераадольвалі за 5 мінут, 500 метраў — амаль за тры. А на фінішы дэманстравалі сваё моцнае здароўе і весела ўсміхаліся...

Гістфак устанавіў таксама своеасаблівы «рэкорд». На першым курсе займаецца 150 студэнтаў, а ў кросе ўдзельнічала 37 чалавек. Астатнія не з'явіліся на стадыён. А тыя, што прыйшлі, не пажадалі падтрымаць гонар факультэта. «Лена, давай адстанем!» — чулася сярод дзяўчат. І Лена (Галя, Валя, Каця...) збаўлялі тэмп і амаль пераходзілі на хадзьбу.

Дарэчы, не першы раз мы бачым такія адносіны спартсменаў гістфака да спаборніцтваў. У маі гэтага года на вясновы крос гісторыкі таксама не прыйшлі. Не бачна іх і на іншых стартах. Хочацца задаць пытанне камітэту камсамола і спортбюро факультэта: «Дакуль гэта будзе працягвацца?»

### ● ПРЫЕМНАЯ НЕЧАКАНАСЦЬ

НІХТО не мог прадбачыць добрага выступлення географаў, акрамя іх саміх. На спаборніцтвах старшыня спортбюро Аляксандр Карлоўскі і член спортбюро Валянціна Парфеяновіч гаварылі, што сёлета спартыўна-масавая работа на факультэце павінна ажывіцца. У састаў спортбюро ўведзены людзі, якія зацікаўлены спортам. У асабістым заліку перамог прадстаўнік геафака Вячаслаў Кузьмін. Яго рэзультат — 2 мінуты 54 секунды.

Анатоль Сяргеевіч Ішчанка, намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту, быў задаволены:

**— Наш поспех заключаецца ў падрыхтоўцы. Не, не падумайце, што ў нас ёсць вялікія майстры. На занятках па фізвыхаванню мы спецыяльна рыхтаваліся да спаборніцтваў. Студэнтам даваў заданні на дом. Пасля заняткаў на стадыёне можна было ўбачыць геафакаўцаў, якія трэніраваліся. Наша праца не была дарэмнай. Мы ўпершыню заваявалі прыз газеты «Беларускі універсітэт». Пастараемся паспяхова выступаць і далей.**

Перамагла каманда геафака. Перамагла ўпершыню, яшчэ раз даказаўшы, што кожны факультэт можа дабівацца добрых вынікаў.

У заключэнне прыводзім табліцу агульнакаманднай барацьбы (у першай калонцы стаяць ачкі, якія набралі каманды ў гэтых спаборніцтвах; у другой — ачкі, якія ідуць у залік спартакіяды):

| | | |
|---|---|---|
| **геафак** | **80,74** | **180** |
| **факультэт радыёфізікі і электронікі** | **79,74** | **155** |
| **хімфак** | **77,37** | **130** |
| **юрфак** | **75,81** | **110** |
| **біяфак** | **75,76** | **100** |
| **журфак** | **74,32** | **90** |
| **мехмат** | **74,04** | **80** |
| **фізфак** | **73,55** | **70** |
| **ФПМ** | **72,32** | **60** |
| **філфак** | **70,57** | **50** |
| **гістфак** | **17,96** | **40** |

Упершыню ў гісторыі спаборніцтваў былі вызначаны лепшыя студэнцкія групы факультэтаў. Зноў поспех спадарожнічаў географам. На другім месцы — другая група факультэта журналістыкі, на трэцім — другая група юрфака.



● ФЕЛЬЕТОН

# ВЯСЕЛЛІ ПАХМЕЛЛІ

Я ІШОЎ уздоўж універсітэцкага гарадка. Час быў не самы ранні. Нават далёка не самы. Цемната, хоць вока выкалі. Здаецца, сустрэў бы самога сябе, не пазнаў. Пад нагамі па-здрадніцку шамацела перасохлае лісце. Навокал, бы тыя монстры, цягнулі ва ўсе бакі галіны-рукі каштаны. Падвываў паўночны восеньскі вятрыска, а злодзейскі паўпрофіль месяца надаваў свайго жаху.

Кажуць, што іменна такой парой, бліжэй да сярэдзіны кастрычніка, ля ВНУ збіраюцца здані — безцялесыя абалонкі студэнтаў, якія былі некалі выключаны з інстытутаў або універсітэтаў. Яны блукаюць усю ноч ля дзвярэй, зазіраюць у вокны і не даюць, як звычайна, дастаткова беспрабудна адпачываць начным вартаўнікам.

Мо гэта і байкі, але ж... Ды і наогул, хто ведае, што можа здарыцца з чалавекам ноччу? Таму я спяшаўся як мага хутчэй мінуць гэта месца. І раптам...

— Ну ж, дык мы цябе і зачакаліся! — грымнуў над самым вухам голас.

Усё адбылося так знянацку, што адзінае, аб чым падумалася ў той момант, тое, што голас гэты мог належаць толькі былому студэнту гістарычнага факультэта С. Аляксеенку. Асобе, добра вядомай дзякуючы дэбошам у карчме «Старавіленская». І тут з перапуду я пачаў губляць прытомнасць. Таму за бездакорна-пратакольнае апісанне таго, што адбывалася далей, я зараз, вядома, адказваць не магу. Памятаю толькі, як дзве здані падхапілі мяне пад рукі і пацягнулі ўздоўж сцяны ў завуголле.

— Усе ўжо сабраліся. Ты ж мерапрыемства зрываеш.., — зноў голасам С. Аляксеенкі прасіпела здань з правага боку.

— Якое мерапрыемства? — Пралепятаў я, пакрысе прыходзячы ў сябе.

— Як якое? Ты што, зусім розум адпіў? Добра закусваць патрэбна пасля кожнага трэцяга келіха, — узарвалася маўчаўшая дагэтуль здань злева. Мне здалося, гэты голас я таксама ўжо недзе чуў, і што належыць ён аспіранту факультэта радыёфізікі і электронікі У. Варыякову:

— Канферэнцыя ў нас зараз пачынаецца. Ці ты не памятаеш? Канферэнцыя па пытанню: «Ці варта шукаць трэцяга?» Разумееш, з'явілася мноства прыхільнікаў таго, каб яе, гэтую самую, дзяліць толькі на дваіх...

— Гэта ўжо кончаныя алкаголікі. — уставіла сваё слова здань голасам С. Аляксеенкі.

— Во, праўду кажаш, кончаныя. Я наогул лічу, што так нельга. Гэта супраць традыцый...

Але здань, што казала голасам аспіранта У. Варыякова, не паспела прывесці ўсе свае аргументы. Мы збочылі за вугал, у прыцемкі, і спыніліся. Я адчуў, што мы тут не адны, а праз якую хвіліну, калі вочы прызвычаіліся, пачаў распазнаваць і такія-сякія постаці.

Ба, знаёмыя ўсе твары! Вунь хімфакаўцы Д. Сіленка, Л. Бандаровіч і У. Рыжух, вунь нервова аглядваюцца па баках магчыма будучыя юрысты С. Пікулік і С. Калакольчыкаў. Вось выхаванцы мехмата В. Мухамецьянаў і Ю. Місевіч. А побач і больш сталая публіка: У. Ліштван, старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання, майстар вытворчага навучання А. Архіпаў, вадзіцель М. Петрыкевіч, А. Рудаў з хімфака...

— Усе ў зборы. Ёсць прапанова пачаць канферэнцыю.

— Пачаць... пачаць... — нястройна адгукнулася грамада ў 65 галасоў. Іменна такой лічбай вымяралася на гэты кастрычніцкі дзень колькасць наяўных прыхільнікаў «той самай», якую па традыцыі дзеляць на траіх.

— Прапаную старшынёй абраць выкладчыка механіка-матэматычнага факультэта А. Пальцава. У нашай справе барацьбы з «зялёным змеем» метадам яго сістэматычнага знішчэння ў гэтага таварыша ёсць багаты вопыт і заслугі. Толькі ў гэтым годзе ён ужо двойчы пабываў у выцвярэзніку! Бескампраміснае знішчэнне «зялёнага» сябр.., прабачце, змія, каштавала яму пэўных затрат здароўя, непрыемнасцей на рабоце, дзе ён быў вызвалены ад педагагічнай дзейнасці, сварак у сям'і.

— Прапаную ў прэзідыум Ю. Нядзельку, студэнта філфака... — Але голас прапаноўцы быў заглушаны хваляй абурэння.

— Ды што ён такое, твой Нядзелька? Нават выспацца як след не змог на падлозе вакзала станцыі «Мінск»...

— Тут жа і забралі...

— Малады яшчэ надта...

З дальняга вугла да ўсіх даляцела імя новай кандыдатуры:

— А. Барысевіч, студэнт фізічнага факультэта. Гэты таварыш хоць і не вызначаецца сталасцю, але ўжо зарэкамендаваў сябе як актыўны, мэтанакіраваны хлапчына, які не толькі сам прыкладваецца да рыльца, але і прыахвочвае да гэтай справы іншых. Памятаеце, як слаўна ён 28 мая спаіў падлетка А. Чубара? А потым — запісана ў пратаколе — яны абодва на вуліцы Кірава «сваімі паводзінамі і знешнім выглядам абражалі чалавечую годнасць».

— Прымаецца! — загулі паплечнікі А. Барысевіча.

— Чакайце, чакайце, — я пазнаў голас студэнта хімічнага факультэта Д. Васілеўскага, які аднойчы праславіўся ў клубе імя Дзяржынскага тым, што «кепска арыентаваўся ў наваколлі і чапляўся да грамадзян», — мы ж забыліся на тых, каго ўжо болей няма ў нашых радах, але хто, як меў розуму, рухаў справу наперад. Прапаную ўключыць іх у якасці ганаровых членаў. Гэта дацэнт А. В. Самускевіч. Бяда напаткала яго нечакана. Пасля таго, як 06.01.84 ён, п'яны «у дым», быў дастаўлены ў медвыцвярэзнік, кіраўніцтва кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі адмовіла яму ў далейшым выкладанні дысцыпліны.

Яшчэ менш пашанцавала лабаранту хімічнага факультэта А. Міхальчыку. Нарады дружыннікаў і міліцыя тройчы падбіралі яго непрытомнага на вуліцах горада і прыводзілі ў стан, калі ён здольны быў даваць адказы на пытанні, пад халодным душам. 27.06.84 ён быў звольнены па артыкулу...

...Я ўжо цалкам апамятаўся і зразумеў, што апынуўся на пахмеллі чужога банкету, на які мяне зацягнулі, прыняўшы за «свайго». Яшчэ раз азірнуўся па баках і пачаў патроху пасоўвацца з натоўпу. Урэшце выбраўся. А вакол «прэзідыума» усё яшчэ не сціхалі спрэчкі выбараў. Што ж будзе, калі справа дойдзе да асноўнага пытання канферэнцыі: на дваіх ці на траіх дзяліць паўлітроўку? А калі тут жа пяройдуць да практычных вопытаў?

І я накіраваўся хутчэй шукаць дружыннікаў.

Віктар ЧАРНЯЎСКІ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

25 кастрычніка 1984 г.

Зак. 1689. АТ 10486

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЕЎ